С. В. СЦЕПАНЮК
Брэст, ДУА «СШ № 7 г. Брэста»

РАБОТА З ТЭКСТАМ ЯК ДЗЕЙСНЫ КАМПАНЕНТ ФАРМІРАВАННЯ КУЛЬТУРЫ МАЎЛЕННЯ НА ЎРОКАХ РОДНАЙ МОВЫ

Неацэнную ролю ў фарміраванні камунікатыўнай кампетэнцыі вучняў, умення вучыцца, у матывацыі да вучэння, у развіцці творчых здольнасцяў навучэнцаў можа, безумоўна, адыграць *тэкст*. Праблемай развіцця маўлення праз працу з тэкстам займаліся многія навукоўцы. Так, на думку прафесара В. У. Протчанкі, “тэкст з’яўляецца адной з найгалоўнейшых крыніц, адкуль вучні атрымліваюць веды, гэта і дыдактычны матэрыял, які выпрацоўвае практычныя маўленчыя ўменні і навыкі, гэта, нарэшце, узор і стымул для стварэння самастойнага выказвання” [2, с. 115].

Тэкст уздзейнічае на маўленчае развіццё любога дзіцяці, таму менавіта праца з канкрэтным тэкстам займае ўсё больш грунтоўнае месца на сучасных уроках беларускай мовы і літаратуры. Стымуляванне маўленння адбываецца ў працэсе непасрэдных зносін са з’явамі жыцця, людзьмі, у сітуацыі зносін са сверснікамі і настаўнікам у класе. Таму клопат аб “моўным асяроддзі” складае адну з асноўных умоў маўленчага развіцця. Моўнае развіццё заснавана на моўным чуцці. Моўнае чуццё праяўляецца ва ўменні слухаць, рэагаваць, магчымасці хутка запамінаць словы, выразы, доўга захоўваць іх у моўных зносінах, разумець сітуацыю зносін і будаваць сваё маўленне ў адпаведнасці з канкрэтнай сітуацыяй.

Прынцып тэкстацэнтрычнага падыходу – гэта прынцып прызнання тэксту ў якасці важнейшай адзінкі навучання беларускай мове і літаратуры. У аснове гэтага прынцыпу ляжыць адзінства моўнай, маўленчай, правапіснай кампетэнцый. Выпрацоўваюцца яны наступнымі відамі дзейнасці на ўроках: *гаварэннем, чытаннем, слуханнем*. Адначасоватэкст мае ярка выяўленуюідэю, якая раскрываеццапразягозмест. Такімчынам, правільнападабранытэкстнясе ў сабе і важную выхаваўчуюфункцыю.

Тэкст – гэта аснова стварэння на ўроках беларускай мовы развіццёвага маўленчага асяроддзя. Менавіта *тэкст* – асноўны кампанент структуры падручніка па беларускай мове, менавіта праз тэкст рэалізуюцца ўсе мэты навучання ў іх комплексе: *камунікатыўная, адукацыйная, развіваючая, выхаваўчая*.

Выкарыстанне **тэксту** пры вывучэнні беларускай мовы забяспечвае рашэнне такіх важных праблем школьнай адукацыі, як…

далучэнне навучэнцаў да духоўнага багацця і прыгажосці роднай мовы

выхаванне беражлівых і ўдумлівых адносін да слова

Усе гэтыя мэты рэалізуюцца, калі выкарыстоўваць розныя формы, метады і прыёмы працы з тэкстам на ўроках беларускай мовы.

Адным з эфектыўных відаў працы на ўроках беларускай мовы з'яўляецца аналіз вучэбных тэкстаў, які ўключае непасрэднае выяўленне сэнсу такіх тэкстаў іх паглыблены аналіз. Ніжэй прыводзім прыклады тэкстаў з рознымі заданнямі.

Родная мова

Роднаямова – тая, што першая засвоена ў дзяцінстве ў сямейным асяроддзі ішто застаецца зразумелай на ўсё жыццё. Родная мова– тая, на якойчалавекубольшлёгка і проста разважаць, большзручна і прывычначым на якой-небудзьіншаймове, выказваць свае думкі і пачуцці.

Роднайназываюць і мовунацыі, засвоеную з дзяцінства. Гэтамовабацькоў, мовасвайго народа *(Паводле А. Міхневіча).*

Заданні да тэксту:

– Праштогэтытэкст?

– Якуюмовуназываюцьроднай?

– Як вы разумееце сэнс сказа «Роднайназываюць і мовунацыі, засвоеную з дзяцінства»?

– Якая мова родная для вас?

– Спішыце тэкст, рашаючы арфаграфічныя задачы. *(Для гэтага ў тэксце варта зрабіць пропускі на месцы арфаграм або пунктаграм у адпаведнасці з мэтай і задачамі канкрэтнага ўрока.)*

Мова

Дзякуючы мове чалавек здольны назапашваць веды і перадаваць іх іншым людзям, пазнаваць свет, прыгадваць мінулае і праектаваць будучыню.

Моваідзе за чалавекампразусёжыццё, янавядзе нас па жыцці. Жыцьсяродлюдзей без мовынельга, бомова–асноўнысродакзносін. З дапамогаймовы мы выказваем свае мары, думкі і пачуцці.

Мовавалодае*вялікай*сілай: словам можнапараніцьчалавека, а можна і наадварот: добрае слова чужы*боль*залечыць*(Паводле А. Міхневіча)*.

Заданні да тэксту:

– Праштогэтытэкст?

– Для чагопатрэбначалавекумова?

– Як выразумееце выраз «Моваідзе за чалавекампразусёжыццё»?

– Прывядзіцепрыклады, якіяпацвярджаюць, штомова мае вялікуюсілу.

– Спішыце тэкст, рашаючы арфаграфічныя задачы. *(Для гэтага ў тэксце варта зрабіць пропускі на месцы арфаграм або пунктаграм у адпаведнасці з мэтай і задачамі канкрэтнага ўрока.)*

Мы прыходзім да высновы, што праца з тэкстам дазваляе дасягнуць наступных вынікаў: у большасці навучэнцаў фарміруецца станоўчая матывацыя вывучэння беларускай мовы і літаратуры; больш эфектыўна адбываецца развіццё інтэлектуальных уменняў і навыкаў навучэнцаў, фарміруецца ўменне творчага падыходу да рашэння вучэбных задач, удасканальваецца маўленчае развіццё; павышаецца культурны ўзровень, што дазваляе навучэнцам дасягнуць рэальных поспехаў у вучобе, розных конкурсах, алімпіядах; павышаецца ўзровень камунікатыўнай і моўнай кампетэнцый.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Канцэпцыявучэбнагапрадмета «Беларускаямова». Адукацыйны стандарт вучэбнагапрадмета «Беларускаямова» // Роднае слова. – 2009. – № 8. – С. 79–111.

2. Протчанка, В. У. Актуальныя праблемы тэорыі і практыкі навучання беларускай мове / В. У. Протчанка. – Мінск : НІА, 2001. – 115 с.